Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 САКАВІКА 2016 г. ПЯТНІЦА № 42 (28152) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## УВАСАБЛЕННЕ СПРАВЯДЛІВАСЦІ І БЯСПЕКІ

*Таварышы афіцэры і генералы, паважаныя супрацоўнікі органаў унутраных спраў, дарагія ветэраны!*

Ад усёй душы віншую вас з прафесійным святам — Днём міліцыі.

Увасабляючы для нашых грамадзян справядлівасць і бяспеку, органы ўнутраных спраў заслужылі самую годную ацэнку не толькі кіраўніцтва краіны, але і ўсяго беларускага народа.

Вашы структурныя падраздзяленні маюць магутны патэнцыял і здольны ўпэўнена кантраляваць становішча, папярэдзіць абвастрэнне крымінагеннай сітуацыі, надзейна абараніць грамадства і кожнага грамадзяніна ад любых злачынных замахаў.

Перакананы, што асабовы склад МУС будзе і надалей эфектыўна вырашаць пастаўленыя задачы з улікам сучасных патрабаванняў і ўмоў, прымнажаць выпрацаваныя дзесяцігоддзямі бездакорнай службы традыцыі, з гонарам і годнасцю служыць Айчыне!

У гэты святочны дзень шчыра зычу вам моцнага здароўя, дабрабыту і поспехаў у вашай нялёгкай працы на карысць нашай Радзімы!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЗАБАРОЎСКІ, першы намеснік міністра эканомікі:**

*«Беларуская эканоміка ў 2011—2015 гадах прырасла на 5,9 працэнта. Планавалася, што краіна дасягне значна больш высокіх паказчыкаў. Аднак Беларусь у той ці іншай ступені інтэгравана ў сусветную фінансавую сістэму і не магла не адчуць на сабе глабальных змяненняў, якія адбыліся ў апошнія гады. Цяпер складана прадбачыць, якая кан'юнктура складзецца на сусветным узроўні. Але пры гэтым урад краіны ставіць перад сабой задачу дабіцца да 2020 года тэмпаў росту ВУП, якія перавышаюць агульнасусветныя. Пры гэтым, трэба сказаць, ніякі ўрад не можа закладваць у задачы на будучае рэцэсію».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 2° |
| Віцебск | 0° |
| Гомель | + 1° |
| Гродна | + 1° |
| Магілёў | 0° |
| Мінск | + 1° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.03.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 21362,00 | ▲ |
| Еўра | 23210,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 289,66 | ▲ |
| Укр. грыўня | 818,47 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# КАЛІ СПРАВА — ПРЫЗВАННЕ,

## або Спакой сталіцы і ў жаночых руках




Фота Надзеі БУЖАН.

**Сняжана Барычэўская — гонар 5-га ўзвода палка ППСМ ГУУС Мінгарвыканкама. Яна — першая і адзіная дзяўчына ў Партызанскім раёне сталіцы, якая працуе на аўтапатрулі. Сяржант міліцыі расказвае, як яе прынялі калегі-мужчыны, тлумачыць, чаму на службе асноўная прычоска — хвост, узгадвае самыя «яркія» дзяжурствы і дзеліцца задумкамі наконт свайго вяселля.**

СТАР. 4

■ Расклад на заўтра

## СЛОВЫ ЎДЗЯЧНАСЦІ НАСТАЎНІКАМ ТРЭБА КАЗАЦЬ СВОЕЧАСОВА

### Як Міністэрства адукацыі разам з галіновым прафсаюзам шукае адказы на няпростыя пытанні?

**«Мне б хацелася, каб наш прафсаюз быў больш прынцыповы ў адстойванні агульных пазіцый, паколькі праблем у галіне адукацыі пакуль хапае. Нельга дапускаць, каб СМІ нападалі на педагогаў. А прафсаюз — гэта рэальны памочнік настаўнікаў. Дык давайце разам адстойваць гонар і годнасць сістэмы адукацыі і ўзнімаць у грамадстве прэстыж прафесіі педагога!» — такую думку выказаў на калегіі, прысвечанай падпісанню пагаднення паміж Міністэрствам адукацыі і Беларускім прафсаюзам работнікаў адукацыі і навукі на 2016—2019 гады, міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.**

### ПЕДАГОГІКА ЦІ АРМІЯ?

Кіраўнік галіны ўпэўнены, што вельмі да месца была б дапамога прафсаюзнай арганізацыі маладым спецыялістам — паколькі заробкі ў пачаткоўцаў даволі сціплыя, да таго ж ім часта даводзіцца здымаць па месцы свайго размеркавання жыллё.

У 2013—2015 гадах ва ўстановы адукацыі было накіравана па размеркаванні больш як 15 тысяч выпускнікоў, якія атрымалі вышэйшую і сярэднюю спецыяльную педагагічную адукацыю: у 2013 годзе — 4730 чалавек, у 2014 годзе — 5071 чалавек і летась — 5536.

— Пытанні па замацаванні маладых спецыялістаў і іх сацыяльнай падтрымцы знаходзяцца на пастаянным кантролі ўпраўленняў адукацыі аблвыканкамаў, — запэўнівае **намеснік міністра адукацыі Раіса СІДАРЭНКА**. — Прычым у кожным рэгіёне свой досвед...

Да такіх мер сацыяльнай падтрымкі адносяцца частковая аплата за арэнду жылля, арганізацыя бясплатнага праезду або частковая аплата праезду, прадастаўленне дадатковага водпуску, павышэнне тарыфных ставак (акладаў) на 10%, штомесячныя даплаты ў памеры тарыфнай стаўкі першага разраду, садзейнічанне ў атрыманні льготных крэдытаў на набыццё хатняй маёмасці, тавараў першай неабходнасці выпускнікамі, што працуюць па размеркаванні не па месцы жыхарства бацькоў, і гэтак далей.

СТАР. 3

■ Сітуацыя

## ВЯЛІКАЙ ПАВОДКІ СЁЛЕТА НЕ ЧАКАЮЦЬ

### Але небяспека талых вод захоўваецца

**Зіма, якая сёлета раптоўна абарвалася ў канцы студзеня, перанесла паводку на люты. З-за гэтага ў басейнах большасці рэк істотны снегавы запас адсутнічае. Зараз узровень вады не дасягнуў максімальнага толькі на Сажы і Прыпяці, а на астатніх вялікіх рэках ён ужо нават зніжаецца.**



Сям-там вада выйшла на пойму рэк. Месцамі разліліся Нёман, Нараў, Прыпяць, Стыр, Случ, Пціч. Аднак паводка гэтая чыста сімвалічная — паплавы апынуліся пад вадой на глыбіні ўсяго ад 5 да 40 сантыметраў. Шырокіх разліваў сёлета сіноптыкі не назіраюць і пакуль не чакаюць.

СТАР. 3

# КАДРАВЫЯ РАШЭННІ ПРЭЗІДЭНТА

**Кіраўнік дзяржавы прызначыў:**

ІВАНОВА Алега Мікалаевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Таджыкістан, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Ісламскай Рэспубліцы Афганістан па сумяшчальніцтве.

ГУР'ЯНАВА Аляксандра Яўгенавіча, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ў Італьянскай Рэспубліцы, пастаяннага прадстаўніка Беларусі пры Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі Аб'яднаных Нацый па сумяшчальніцтве, — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Мальта па сумяшчальніцтве.

**Прэзідэнт даў згоду на прызначэнне:**

БАРЫСЮКА Генадзя Іосіфавіча — кіраўніком адміністрацыі Ленінскага раёна г. Брэста;

ЛІНЕВІЧА Анатоля Канстанцінавіча — старшынёй Капыльскага райвыканкама;

ВАЙНІЛКІ Анатоля Мар'янавіча — старшынёй Мядзельскага райвыканкама;

ВАСІЛЕЎСКАГА Дзмітрыя Уладзіміравіча — старшынёй Дрыбінскага райвыканкама;

КАСМАЧОВА Міхаіла Міхайлавіча — старшынёй Чэрыкаўскага райвыканкама;

ДАРАХОВІЧА Аляксандра Вікенцьевіча — кіраўніком адміністрацыі Заводскага раёна г. Мінска;

ТРУШЧАНКІ Юрыя Уладзіміравіча — кіраўніком адміністрацыі Савецкага раёна г. Мінска;

ШАСТАКОВА Яўгена Андрэевіча — намеснікам міністра замежных спраў;

ВОЙТАВА Ігара Віталевіча — рэктарам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»;

ЗЯНЕВІЧА Андрэя Алегавіча — рэктарам установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія сувязі»;

РАБАВАЙ Ганны Мікалаеўны — намеснікам міністра сувязі і інфарматызацыі;

АЎРАМЕНКІ Аляксея Мікалаевіча — першым намеснікам міністра транспарту і камунікацый;

ЛЯХНОВІЧА Аляксея Аляксеевіча — намеснікам міністра транспарту і камунікацый;

ШЫЛАВА Ігара Сяргеевіча — першым намеснікам начальніка Беларускай чыгункі;

АРУШАНЬЯНЦА Пятра Барысавіча — дырэктарам дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь (на перыяд знаходжання дырэктара ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў);

ЮРЧАНКІ Мікалая Мікалаевіча — начальнікам дэпартамента абаронных прамысловасці і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы;

СЫСОЕВА Аляксандра Уладзіміравіча — кіраўніком спраў Віцебскага аблвыканкама;

АШУРЫКА Паўла Станіслававіча — членам Гродзенскага аблвыканкама.

Звяртаючыся да кіраўнікоў мясцовых органаў улады, Аляксандр Лукашэнка заклікаў іх цвяроза ацэньваць неабходнасць рэалізацыі на месцах тых ці іншых ініцыятыў. На думку кіраўніка дзяржавы, перш чым нешта рабіць, неабходна задаваць пытанне аб мэтазгоднасці і своечасовасці планаваных крокаў. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сам кіруецца такім жа прынцыпам пры прыняцці рашэнняў дзяржаўнага ўзроўню.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў няпростых эканамічных умовах варта паспяхова правесці ўсе веснавыя палявыя работы. «Трэба ўсюды мець сістэму і навесці парадак. Парадак павінен быць ва ўсім! Не трэба залішне заціскаць людзей: няхай працуюць, паказваюць сябе. Але тэхналагічную дысцыпліну нiхто не адмяняў. І гэта жалезна павінна быць, уся ваша праца павінна быць падпарадкавана гэтаму, і ўсе павінны круціцца вакол гэтых тэхналогій», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу прадпрыемствам вырабіць у неабходным для вёскі аб'ёме ўгнаенні з тым, каб не вывозіць валюту з краіны, закупляючы за межамі Беларусі тое, што можна вырабіць самім.

«І самае галоўнае — у нас усё ж такі ўлада жорсткая, вельмі жорсткая. Людзі гэта адчуваюць. Але гэта не значыць, што мы людзей павінны пастроіць, як у арміі, і строем або, не дай Бог, статкам кудысьці вадзіць і забараняць: крок улева, крок управа, слова не скажы, рот зашыў. Ні ў якім разе гэтага рабіць нельга, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Таму права чалавека — сказаць тое, што ён думае, у патрэбным месцы: на сходзе, пры абмеркаванні з калегамі, вам прама ў вочы — гэтага не трэба баяцца. Гэта плюс у нас будзе. Але калі прыйшоў на працу, там рот павінен быць, груба кажучы, зашыты, таму што там дыктат ажыццяўляе тэхналогія. Своечасова прыйшоў, зрабіў па тэхналогіі справу — ідзі. Бачыш, нешта не так — папярэдзь кіраўнікоў сваіх, скажы, прапануй».

Кіраўнік дзяржавы папрасіў кіраўнікоў мясцовай вертыкалі ўлады ўважліва ставіцца да кадраў, падбіраючы на адказныя ўчасткі працы прафесіяналаў, на якіх можна абаперціся.

Звяртаючыся да Алега Іванова, прызначанага пасло м у Таджыкістане і Афганістане па сумяшчальніцтве, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што ў адносінах Беларусі і Таджыкістана няма ніякіх праблем, у Беларусі моцныя пазіцыі ў гэтай краіне, вельмі добрыя адносіны з кіраўніцтвам Таджыкістана. «Таму з гэтай пляцоўкі мы можам супрацоўнічаць з дзяржавамі, якія знаходзяцца побач», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы. Што тычыцца Афганістана, то, на думку Прэзідэнта, гэта «краіна вельмі багатая, яна развіваецца, насельніцтва нямала, вельмі выгадны ў стратэгічных адносінах рэгіён».

Даючы згоду на прызначэнне рэктараў ВНУ, кіраўнік дзяржавы спыніўся на праблемах практычнага ўкаранення навуковых распрацовак. У іх ліку адзначаўся недастатковы ўзровень узаемадзеяння паміж работнікамі вытворчасці і навукоўцамі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Нацыянальная акадэмія навук павінна вызначаць і прапаноўваць прадпрыемствам прарыўныя, выгадныя для дзяржавы тэхналогіі.

**Паводле БЕЛТА.**

■ Медыяпрастора

# РЭАЛІЗОЎВАЦЬ СЯБЕ І РАЗВІВАЦЬ ПРАФЕСІЮ

## Жанчыны робяць журналістыку больш гуманнай і ўдумлівай

**Такую думку выказала міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ падчас віншавання жанчын-кіраўнікоў галіны друку напярэдадні 8 сакавіка. За кубкам гарбаты ў Доме прэсы сабраліся тыя, хто ўзначальвае СМІ, выдавецтвы, прэс-службы дзяржаўных органаў.**




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— У нас працуе шмат цудоўных жанчын, — адзначыла міністр. — І, як бачым, сярод іх нямала кіраўнікоў. Гэта вынік гендарнай палітыкі ў краіне. Сёння жанчына не замыкаецца ў сваім сямейным коле — у яе ёсць цудоўная магчымасць рэалізаваць сябе як творчую, сацыяльна актыўную асобу. Вельмі прыемна, што дзякуючы ім мы атрымліваем добрую кніжную прадукцыю, а наша журналістыка становіцца больш гуманнай, добрай, удумлівай.

Прафесія журналіста сёння ў большай ступені жаночая. Не таму, што мужчыны астылі да гэтай спецыяльнасці, а таму што жанчыны хочуць рэальна ўдзельнічаць у развіцці гэтага важнага сегмента, фарміраваць грамадскую думку. «Журналістыка жаночая — гэта вялікія праекты, накіраваныя на ўзмацненне маральнасці, пашырэнне праблемна-тэматычнага поля», — лічыць Лілія Ананіч.

Закранаючы пытанне работы прэс-службаў, міністр інфармацыі заўважыла, што прэс-сакратар мусіць быць аўтарытэтнай фігурай. Яго абавязкі — гэта не толькі арганізацыя кантактаў і сувязяў са СМІ. Трэба самому ўмець пры неабходнасці даць кампетэнтны каментарый. Што да адкрытасці дзяржаўных структур, то мусяць быць дакладныя правілы атрымання і распаўсюджвання інфармацыі. Прэс-сакратару варта адсочваць, як трансфармуюцца звесткі ў газетах, тэле- і радыёвяшчанні.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Дзяржава і бізнес

# КРОПКІ РОСТУ

## На Асамблеі дзелавых колаў абмеркавалі Нацыянальную платформу бізнесу

**Ключавой падзеяй тыдня беларускага прадпрымальніцтва з'яўляецца Асамблея дзелавых колаў. Яна ўжо 17-я па ліку і мае назву «Выклік крызісу». Традыцыйна ў ёй удзельнічаюць лідары бізнесу, заснавальнікі і дырэктары прыватных прадпрыемстваў, кіраўнікі і спецыялісты міністэрстваў і ведамстваў, дыпламаты, прадстаўнікі рэгіянальных і галіновых бізнес-асацыяцый Беларусі. Удзельнікам асамблеі прэзентавалі праект «Нацыянальнай платформы бізнесу Беларусі — 2016». Як адзначыў міністр эканомікі Уладзімір Зіноўскі, Асамблея дзелавых колаў з'яўляецца не толькі дыялогавай пляцоўкай, на якой выяўляюцца інтарэсы дзелавой супольнасці, але і сувязным звяном паміж урадам і бізнесам.**




Фота БЕЛТА.

### РЭАЛІЗАВАНА 380 ПРАПАНОЎ

Правядзенне XVII Асамблеі дзелавых колаў Беларусі паказчык таго, што бізнес-супольнасць займае сёння актыўную пазіцыю ў вядзенні дыялогу паміж уладай, прадпрымальнікамі і грамадзянскай супольнасцю. Данесці свае ідэі па развіцці і паляпшэнні дзелавога клімату Беларусі, пачынаючы з 2006 года, бізнесменам дапамагае Нацыянальная платформа бізнесу. Дзякуючы папярэднім яе выпускам на заканадаўчым узроўні рэалізавана больш за 380 прапаноў. Старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў Уладзімір Карагін падчас мерапрыемства прадставіў чарговы яе праект. У гэтым годзе ў ім утрымліваецца 80 прапаноў па такіх прыярытэтных кірунках як добрасумленная канкурэнцыя, эфектыўная дэбюракратызацыя, рэгулятарная аптымізацыя, эканамічная бяспека, прыватызацыя, адказнае партнёрства. Варта адзначыць, што з Нацыянальнай платформы мінулага года прынята 26 прапаноў, яшчэ 18 разглядаюцца.

### ЭКСПАРТНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ БУДЗЕ ПАШЫРАЦЦА

Для прадпрымальнікаў сёння вельмі важным з'яўляецца разуменне таго, якія перспектывы іх чакаюць у развіцці Вялікага шаўковага шляху, у прыцягненні інвестыцый, у развіцці экспарту. На Асамблеі дзелавых колаў гэтаму ўдзялілі асаблівую ўвагу. Падчас мерапрыемства міністр замежных спраў Уладзімір Макей адзначыў, што ў МЗС плануецца да канца сакавіка дапрацаваць Нацыянальную праграму «Экспарт Беларусі» на 2016-2020 гады, а затым прадставіць дакумент у Савет Міністраў. Ён падкрэсліў, што ў праграме важную ролю займае ўдзел бізнесу.

«Галоўная задача МЗС — ліквідацыя бар'ераў для беларускага экспарту. Калі мы прыцягнем да знешнеэканамічнай дзейнасці хоць бы палову ўсіх малых і сярэдніх прадпрыемстваў краіны, гэта забяспечыць прырост агульнага аб'ёму экспарту, паводле нашых ацэнак, на 25 млрд долараў», — растлумачыў міністр замежных спраў.

Зараз у Беларусі працуе больш за 22 тысячы суб'ектаў гаспадарання. З іх у экспартнай дзейнасці прымаюць удзел менш за палову — 8,8 тыс.

«Беларускі малы і сярэдні бізнес можа паспяхова канкурыраваць на знешніх рынках са сваёй IT-прадукцыяй, запатрабаванымі таксама транспартныя, медыцынскія, турыстычныя і кансалтынгавыя паслугі. Мы гатовыя дапамагчы прасоўваць гэтыя напрамкі на знешніх рынках. Прапановы можна накіроўваць у наш Дэпартамент знешнеэканамічнай дзейнасці», — адзначыў Уладзімір Макей.

Таксама міністр падкрэсліў, што малому і сярэдняму прадпрымальніцтву будзе аказвацца дзяржаўная падтрымка ў вытворчасці экспартаарыентаваных тавараў і паслуг. Асаблівую ўвагу пры гэтым удзеляць рэгіёнам: для аб'яднання намаганняў малога бізнесу ў кожным з іх плануецца стварыць інтэграваныя цэнтры па развіцці міжнароднага дзелавога, тэхналагічнага і навуковага партнёрства. Дзяржпадтрымка такім аб'яднаным структурам будзе больш эфектыўнай.

Акрамя таго ён адзначыў, што цяпер у складзе міжведамаснага савета па знешнегандлёвай палітыцы, які ўзначальвае першы віцэ-прэм'ер Васіль Мацюшэўскі, няма ніводнага прадстаўніка малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Гэты недахоп неабходна хутка выправіць.

«Зараз мы дамовіліся з Рэспубліканскай канфедэрацыяй прадпрымальніцтва аб заключэнні рамачнага пагаднення аб супрацоўніцтве і стварэнні рабочай групы для ўзаемадзеяння па экспартнай тэматыцы, якая магла б абмяркоўваць бягучыя праблемныя пытанні і выпрацоўваць іх рашэнні», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

### СТРАТЭГІЧНЫ ПАРТНЁР

Міністр эканомікі Уладзімір Зіноўскі падчас Асамблеі адзначыў, што дзяржава бачыць у прадпрымальніцтве стратэгічнага партнёра, фактар устойлівага і дынамічнага развіцця эканомікі. З прычыны гэтага Міністэрства эканомікі плануе выйсці з ініцыятывай ва ўрад аб тым, каб павялічыць колькасць прадстаўнікоў дзелавога прыватнага бізнесу ў складзе грамадска-кансультатыўных саветаў (ГКС) у памеры не менш як 50%. Стварэнне ГКС пры органах дзяржаўнай улады стала адным з вынікаў Дырэктывы №4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці ў Беларусі», прынятай у 2010-м. За гэты час створаны 31 такі савет, у 2013—2015 гадах адбылося больш за 250 пасяджэнняў ГКС і больш за 180 пасяджэнняў іншых экспертных фарміраванняў. Цяпер дырэктыва абнаўляецца — яе праект знаходзіцца на разглядзе ў кіраўніка дзяржавы. Міністр эканомікі адзначыў, што ў рабоце над праектам прынялі актыўны ўдзел прадстаўнікі бізнес-супольнасці. Абноўленая Дырэктыва №4 нароўні з Дзяржаўнай праграмай па развіцці малога і сярэдняга прадпрымальніцтва на 2016—2020 гады павінны стаць праграмнымі дакументамі па стварэнні спрыяльных умоў для нарошчвання патэнцыялу прыватнікаў у бягучай пяцігодцы.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

# СЛОВЫ ЎДЗЯЧНАСЦІ НАСТАЎНІКАМ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

**Як вынік — цякучасць кадраў сярод маладых спецыялістаў пасля двухгадовай адпрацоўкі не перавышае цяпер 6—8%. «Але, на наш погляд, і 8 працэнтаў — гэта ўсё ж такі зашмат», — канстатавала Раіса Сідарэнка.**

Прадстаўнікі прафтэхшколы засяродзілі ўвагу яшчэ на адной праблеме — сыходзе з сістэмы прафтэхадукацыі маладых спецыялістаў пасля службы ў арміі. У сярэднім сталічныя ўстановы прафтэхадукацыі прымаюць кожны год на працу па размеркаванні трычатыры маладыя спецыялісты. Але хтосьці з хлопцаў трапляе ўжо пад восеньскі прызыў у войска, а хтосьці — вясной. Такім чынам, яны паспяваюць адпрацаваць усяго некалькі месяцаў, а вось «заразіцца», прасякнуцца педагогікай не паспяваюць. Падчас службы іх мысленне і бачанне свету моцна змяняюцца, многія застаюцца потым служыць у спецпадраздзяленнях... Цякучасць кадраў сярод маладых майстроў у прафтэхустановах даходзіць да 90% (!). Прагучала прапанова: або даваць маладым майстрам, што працуюць у прафтэхустановах, адтэрміноўку (такую ж адтэрміноўку атрымалі некалі падчас будаўніцтва ў сталіцы сур'ёзных аб'ектаў муляры), або залічваць іх адразу ў запас.

## ПРЫНЦЫПОВАЕ СТАЎЛЕННЕ ДА КАДРАЎ

Найважнейшай задачай застаецца павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў. Вышэйшую адукацыю сёння маюць 58,8% педагагічных работнікаў устаноў дашкольнай адукацыі, 92,8% педагагічных работнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, 66,5% работнікаў устаноў спецыяльнай адукацыі, 98,4% выкладчыкаў устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі і 99,3% выкладчыкаў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю маюць 17,1% педагагічных работнікаў устаноў дашкольнай адукацыі, 38% — агульнай сярэдняй, 21% — спецыяльнай адукацыі, 36,3% выкладчыкаў устаноў прафесійна-тэхнічнай і 38,2% выкладчыкаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

А кваліфікацыйную катэгорыю «настаўнік-метадыст», якая прысвойваецца па выніках атэстацыі найлепшым настаўнікам, маюць ужо 120 педагогаў. Для параўнання: у 2013 годзе педагогаў, якія змаглі даказаць атэстацыйнай камісіі свой «вышэйшы пілатаж» у прафесіі, былі 34 чалавекі. У той жа час, як канстатавала Раіса Сідарэнка, ёсць і праблемы.

— Прывяду адзін прыклад. На працягу мінулага года мы разам з прафсаюзам актыўна займаліся прадстаўленнем магчымасці атрымання другой катэгорыі выхавальнікам дашкольных устаноў, якія не маюць профільнай адукацыі. Міністэрствам адукацыі зроблены ўсе неабходныя крокі: падрыхтаваны змены ў Адзіны кваліфікацыйны даведнік пасад служачых, якія прадугледжваюць магчымасць прысваення другой кваліфікацыйнай катэгорыі такім выхавальнікам — пры ўмове засваення імі зместу адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі па профілі «Педагогіка» (напрамак «Педагогіка дзяцінства»). Распрацаваны праграмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі па скарочаным тэрміне, — паведаміла Раіса Сідарэнка. — Наколькі мы змаглі прайсці наперад у гэтым пытанні? **Агульная колькасць выхавальнікаў, якія не маюць адукацыі па профілі, складае па краіне 11 185 чалавек. А перападрыхтоўку выказаў жаданне прайсці 1 471 педагагічны работнік. Ці можна лічыць такі вынік аптымальным? 1,5 тысячы з 11 тысяч?** Мяркую, гэта той выпадак, калі без нашай сумеснай з прафсаюзам працы мы наперад наўрад ці зрушымся. А падвяргаць сумненню неабходнасць працы кваліфікаванага, граматнага педагога немагчыма ў прынцыпе. Урэшце, ад іх залежыць жыццё і бяспека нашых дзяцей!

Самы галоўны здабытак сістэмы адукацыі — гэта людзі, якія працуюць у сістэме, падкрэсліла Раіса Сідарэнка. Вынікі іх працы павінны быць заўважаны, і словы ўдзячнасці сказаны своечасова! Толькі за мінулы год за выніковую працу ў сістэме адукацыі і значны асабісты ўклад у навучанне і выхаванне моладзі дзяржаўныя ўзнагароды (ганаровыя званні, ордэны і медалі) былі ўручаны 49 работнікам сістэмы адукацыі. І 2305 работнікаў атрымалі ведамасныя ўзнагароды.

— Абачлівае, уважлівае, але разам з тым і патрабавальнае, прынцыповае стаўленне да кадраў павінна быць асновай нашага ўзаемадзеяння з прафсаюзам, ды і ўсёй нашай дзейнасці. Разам з прафсаюзам мы шукаем адказы часам на няпростыя пытанні і, як правіла, знаходзім шляхі вырашэння праблем, — дадала намеснік міністра адукацыі.

## «ЖАНОЧЫ ТВАР» ПЕДАГОГІКІ

— Мы пастаянна прыцягваем увагу органаў дзяржаўнага кіравання, дэпутацкага корпуса і грамадства ўвогуле да праблемы павышэння сацыяльнага статусу педагагічных работнікаў, паколькі фінансавы і маральны дабрабыт работнікаў галіны — ключавыя фактары яе якаснага росту, — падкрэслівае **старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА.** — Нягледзячы на ўсе захады, што прымаліся па павышэнні заработнай платы, на жаль, яна застаецца невысокай у нашай галіне. Акрамя таго, частка работнікаў маюць заработную плату на ўзроўні мінімальнай. Невысокая яна з-за нізкага памеру тарыфных ставак, якія вызначаюцца элементамі тарыфнай сістэмы. Цэнтральны камітэт прафсаюза звярнуўся ў Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі з прапановай ініцыяваць перад Саветам Міністраў перагляд усіх элементаў тарыфнай сістэмы.

Галіновы прафсаюз хвалююць і праблемы аплаты працы прафесарска-выкладчыцкага складу ўстаноў вышэйшай адукацыі, паколькі ўсе апошнія спецыяльныя павышэнні заработнай платы, што адбываліся ў галіне, не закранулі гэту катэгорыю. Таму вострай праблемай застаецца прыцягненне ў вышэйшую школу высокакваліфікаваных маладых спецыялістаў.

Між іншым, **сярод першакурснікаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта ў гэтым навучальным годзе хлопцы складаюць 22 працэнты ад агульнай колькасці.** І гэта сітуацыя вельмі абнадзейвае... Пакуль што ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі суадносіны мужчын-педагогаў не на іх карысць: на 86% школа застаецца жаночай. І там вельмі востра адчуваецца дэфіцыт мужчынскага складніка ў выхаванні...



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

**Даведка «Звязды»**

***За 2015 год сярэднямесячная заработная плата па галіне адукацыі склала 4,8 млн рублёў, або 72% ад сярэдняга заробку па краіне. У настаўнікаў — 5,8 млн рублёў, ці 86,6%, і ў прафесарска-выкладчыцкага складу — 8 млн рублёў, або 118,7%.***

## ФІНАНСАВЫ ЭКСПЕРЫМЕНТ

— Пастановай урада з 1 верасня 2014 года аплата працы педагагічных работнікаў павысілася за кошт павелічэння памераў надбавак за наяўнасць кваліфікацыйных катэгорый. Гэта крыху палепшыла сацыяльна-эканамічнае становішча педработнікаў, але значнага павышэння аплаты працы не адбылося, — канстатаваў Аляксандр Бойка. — Летась нарматыўныя прававыя акты на галіновым узроўні па павышэнні заработнай платы работнікаў сістэмы адукацыі не прымаліся. Для выпраўлення сітуацыі, якая склалася, патрабуецца павышэнне заработнай платы работнікам сістэмы адукацыі шляхам увядзення галіновага павышальнага каэфіцыента, каб давесці паказчык сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў адукацыі да рэспубліканскага.

Раіса Сідарэнка паведаміла, што з 2013 па 2015 год у краіне праводзіўся эксперымент па апрабацыі галіновай сістэмы аплаты працы педагагічных работнікаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Сярэдняя заработная плата педработнікаў, якія ўдзельнічалі ў эксперыменце, павысілася ў параўнанні з сярэдняй заработнай платай педагагічных работнікаў у галіне на 20%. Вынікі гэтага эксперымента выкарыстоўваюцца з 1 студзеня 2016 года ў пілотным праекце па нарматыўным фінансаванні ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Кіраўнікам устаноў, што задзейнічаны ў эксперыменце (а гэта 183 установы), дадзена права самастойна фарміраваць штатны расклад у межах выдзеленых сродкаў, аптымізаваць штатную колькасць, а сродкі, што вызваляюцца, накіроўваць на стымуляванне працы работнікаў і ўдасканаленне адукацыйнага асяроддзя.

## НЕДАСЯЖНАЯ «ЗАСЛУЖАНАЯ» ПЕНСІЯ

**Старшыня Баранавіцкай гарадской арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Тамара ШУКАЛА** ўзняла пытанне прафесійнага пенсійнага страхавання педагогаў.

Пэўная частка работнікаў устаноў адукацыі страцілі права выхаду на пенсію па выслузе гадоў, бо не працуюць ва ўмовах, якія адпавядаюць устаноўленым крытэрыям. У іх лік трапілі настаўнікі па прадметах, у навучальных планах якіх не прадугледжаны дадатковы кантроль вучэбнай дзейнасці вучняў. Не ўсе педагогі маюць і гадзіны арганізацыйна-выхаваўчай работы. Такім чынам, **рэальна атрымаць права на пенсію за выслугу гадоў (займець неабходны стаж працы ў асаблівых умовах) змогуць педагогі, якія адпрацавалі ў сістэме адукацыі абодва 35-37 гадоў (жанчыны), або 43-45 гадоў (мужчыны).**

«Мы звяртаемся да Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і Міністэрства адукацыі: прыслухайцеся да просьбаў і прапаноў галіновага прафсаюза па ўнясенні змен у пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 9 кастрычніка 2008 г. № 1490, — заклікала Тамара Шукала. — Неабходна даць педагогам магчымасць выходу на пенсію за выслугу гадоў».

І яшчэ на адну праблему звярнула ўвагу прафсаюзны лідар. Усе дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы знаходзяцца цяпер у складзе аддзелаў адукацыі, спорту і турызму. На жаль, са студзеня 2016 года кіраўнікі ДЮСШ і іх намеснікі пазбаўлены права ажыццяўляць працу ў якасці трэнера-выкладчыка.

— Але ж кіраўнікамі дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ прызначаюцца найбольш вопытныя трэнеры. Без трэнерскай працы кіраўнік проста дыскваліфікуецца, — канстатавала Тамара Шукала. — Таму наша просьба — даць ім магчымасць выводзіць моладзь у людзі, выхоўваць з юных спартсменаў будучых майстроў.

**Надзея НІКАЛАЕВА,**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ВЯЛІКАЙ ПАВОДКІ СЁЛЕТА НЕ ЧАКАЮЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Больш за тое, падчас веснавой паводкі максімальныя ўзроўні вады прагназуюцца блізкімі да аналагічных леташніх значэнняў, — расказала **начальнік аддзела гідралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Марына НАГІБІНА.** — Тады яны сталі гістарычна самымі нізкімі за ўвесь перыяд назіранняў. У басейнах Нёмана, Віліі, Бярэзіны, Прыпяці, Нёмана ўзровень вады падымецца, толькі калі пройдуць моцныя і працяглыя ападкі. У той жа час на Заходняй Дзвіне і Сажы сітуацыя складваецца іншая.

Сіноптыкі мяркуюць, што паплавы сёлета апынуцца пад вадой ненадоўга і толькі на асобных участках рэк. Калі ніякіх нечаканых перамен у надвор'і не здарыцца, то вада падтопіць пабудовы адно ў зонах павышанай рызыкі. Цёплы люты, аднак, можа закласці міну запаволенага дзеяння, як тое здарылася летась. Тады зіма таксама скончылася значна раней, чым належыць, а недахоп ападкаў разам з адсутнасцю снегавых запасаў даволі негатыўна паўплываў на водагаспадарчую дзейнасць.

Як бы там ні было, але да магчымай паводкі рыхтавацца ўсё ж трэба, каб надзвычайная сітуацыя не заспела знянацку.

— У ранейшыя гады вада падтапляла 215 населеных пунктаў у 62 раёнах, — згадвае **начальнік Рэспубліканскага цэнтра кіравання і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі МНС Андрэй ЮРЖЫЦ.** — Мы іх даўно ўзялі пад кантроль. Пастаянна маніторым абстаноўку з дапамогай авіяцыі і спадарожніка, каб параўноўваць маштабы падтапленняў і своечасова выязджаць на дапамогу людзям. Сёлета мы будзем назіраць і за малымі рэкамі, ад якіх таксама можна чакаць неспадзяванкі. І хоць верагоднасць паводкі сёлета невялікая, расслабляцца не трэба. Мы заклікаем загадзя пачысціць і ў жылым сектары, і на тэрыторыях вытворчых аб'ектаў ліўнёўкі і адводы талай вады, якая таксама можа істотна нашкодзіць на лакальнай тэрыторыі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

# ЖУРНАЛІСТЫКА: НАПЕРАД ПРАЗ МІНУЛАЕ

**Ушанаваць памяць доктара філалагічных навук, прафесара Барыса СТРАЛЬЦОВА ў Інстытуце журналістыкі БДУ сёлета вырашылі незвычайна — зладзілі ў яго гонар міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Журналістыка XXI стагоддзя: традыцыі і выклікі новага часу». Падзяліцца вынікамі даследаванняў і абмеркаваць сучасны стан СМІ сабраліся беларускія, рускія, украінскія, славацкія навукоўцы.**

— Эпоха новых тэхналогій, глабалізацыя інфармацыйнай прасторы, безумоўна, наклалі свой адбітак, у тым ліку і на прызначэнні журналісцкай прафесіі. Вельмі важна, каб тыя традыцыі, якія з'яўляюцца фундаментам нацыянальнай інфармацыйнай прасторы, беларускай журналістыкі, не перарываліся, а мацнелі. Таму што ідэалогія канвергенцыі медыйнага асяроддзя дазваляе як захаваць і прымножыць традыцыі, як удыхнуць у іх новае жыццё, так, на жаль, ёсць вялікія магчымасці і спакусы, каб пераварнуць гэтыя традыцыі і знайсці не зусім тое, што вызначала заўсёды беларускую журналістыку, — адзначыла ў вітальным слове **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**, якая ў свой час таксама была студэнткай Барыса Стральцова.

На думку міністра інфармацыі, беларуская журналістыка — гэта журналістыка адказная, стваральная, тая, якой ганарыцца Беларусь, бо яна дапамагала краіне ў часы ліхалеццяў, дапамагае цяпер і будзе надалей дапамагаць незалежнай дзяржаве.

— Фундамент цяперашняй працы факультэта журналістыкі — гэта навукоўцы, прафесары, якія зрабілі наш журфак адным з самых вядомых спачатку ў СССР, а пасля на постсавецкай прасторы, — падзяліўся назіраннямі **дырэктар Інстытута журналістыкі БДУ Сяргей ДУБОВІК.** — Традыцыі, якія заклалі гэтыя людзі ў працу факультэта, жывуць: мы іх шануем, памятаем і прымнажаем.

**Прарэктар Белдзяржуніверсітэта Аляксей ДАНІЛЬЧАНКА** звярнуў увагу на тое, што шостая міжнародная канферэнцыя ў Інстытуце журналістыкі БДУ за гэты навучальны год — праява павагі Барысу Васільевічу, які стаяў ля вытокаў беларускай школы журналістыкі. «І, мэтай, менавіта гэтая канферэнцыя дасць штуршок цяперашнім студэнтам, магістрантам для таго, каб яны таксама прысвяцілі сваё жыццё даследаванням розных аспектаў у галіне журналістыкі», — выказаў свае спадзяванні прарэктар.

**Ганна КУРАК.**

# КАЛІ СПРАВА — ПРЫЗВАННЕ

## Свая сярод мужчын

— Добра, што не спазніліся, — звяртаючыся да нас з фотакарэспандэнтам, кажа Сняжана. — У панядзелак раніцай працы няшмат, але быць напагатове трэба заўсёды.

Дзяўчына спрытна заскоквае ў добра ўсім знаёмы «УАЗік» і поглядам прыспешвае нас. Мы ж, у сваю чаргу, яшчэ толькі намагаемся адкрыць дзверы службовай машыны.

— Наконт маёй кандыдатуры ў кіраўніцтва было шмат пытанняў, а вашы, напэўна, і ўвогуле не разглядалі б, — усміхаецца Сняжана.

Пра тое, як яна сама патрапіла ў міліцыю, дзяўчына расказвае з задавальненнем. Усё пачалося з дзіцячай мары ў пятым класе. Маўляў, буду слабых абараняць. Целасклад і фізічныя даныя дазвалялі.

— Мой бацька і дзед таксама пагоны насілі. Яны ніколі не казалі, што служба — гэта лёгка, але добра ведалі і рабілі сваю справу. На маё жаданне вучыцца ў Акадэміі МУС мужчынская частка сям'і адрэагавала станоўча, жаночая была супраць. Бабуля бачыла ўнучку толькі ўрачом, мама — настаўніцай, — згадвае дзяўчына.

Сняжана паступіла ў жаданую навучальную ўстанову на завочнае аддзяленне. Два гады яна шукала працу па спецыяльнасці, але ў родным Пінску вакансій для дзяўчыны не было. Каб не сядзець без справы і, зразумела, без грошай, яна паралельна скончыла курсы бармэна-афіцыянта і нейкі час падзарабляла ў кавярні.

— Прыязджаючы на сесію ў Мінск, я і тут аббівала парогі аддзяленняў міліцыі. Зразумела, мне не хапала прафесійнай адукацыі, плюс — я дзяўчына, але так хацелася працаваць. Нарэшце маё неўтаймоўнае жаданне заўважылі, — дзеліцца сяржант міліцыі.

Заўважылі таксама здольнасць і байцоўскі характар дзяўчыны. Праз паўгода Сняжану пачалі ставіць старшай на дзяжурствах аўтапатруля. Гэта, трэба сказаць, быў нонсэнс.

— Мы спачатку былі шакаваныя тым, што прыйдзецца працаваць з жанчынай, — уступае ў размову Максім Ганчароў, міліцыянер-кіроўца 5-га ўзвода палка ППСМ. — Што яна можа? І так спраў безліч, а тут яшчэ нянькай зрабіць хочуць! Няхай лепей паперы ў цёплым пакоі перабірае! — расказвае напарнік Сняжаны. — Кіраўніцтва тут, вядома, рызыкнула, але ўпэўнены, сёння не шкадуе.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Фота Надзеі БУЖАН.

«Сёлета Сняжана асабіста раскрыла два рабаванні і затрымала зладзюжку, які знаходзіўся ў вышуку. Такія вынікі не кожны стаіражыл паказвае. Сняжана вельмі працавітая і дысцыплінаваная», — характарызуе нашу гераіню намеснік камандзіра палка ППСМ ГУУС Мінгарвыканкама, маёр міліцыі Дзмітрый Міхалевіч.

Раніца панядзелка сапраўды выдалася ціхай. Тэлефон у дзяжурнай часці маўчыць. Значыць, на вуліцах горада спакойна. Дарэчы, аўтапатруль, да якога мы з фотакарэспандэнтам далучыліся, заўсёды ў дарозе. За змену службовая машына можа праехаць каля 150 кіламетраў.

— Вось тут, — паказваючы на стары пакінуты дом, гаворыць Сняжана — амаль кожны вечар можна знайсці нашых пастаянных кліентаў — людзей без пэўнага месца жыхарства, наркаманаў. Кантынгент, як вы разумееце, не самы прыемны, але спраўляемся. Мне напарнікі не патураюць, прыйшла працаваць — працуй. Я сама, калі трэба, плячо таварышу падстаўлю.

## Размовы для дамовы

Першы і апошні за нашу нядоўгую з фотакарэспандэнтам «змену» парушальнік грамадскага парадку чакаў нас на аўтобусным прыпынку. Мужчына гадоў пяцідзесяці так расслабіўся пасля начной змены, што ледзьве трымаўся на нагах. Пакідаць яго тут — небяспечна. Людзі ў нецвярозым стане — патэнцыйныя ахвяры зладзеяў і хуліганаў.

— Колькі вы выпілі, — пытаецца Сняжана ў нашага новага «спадарожніка». — І калі толькі паспелі?

У адказ чулася нешта кшталту «ды я першы раз», «гэта выйшла выпадкова», «больш такога не паўторыцца».

Дзяўчына кажа, што за год службы перастала верыць у гэтыя кракадзілавыя слёзы. Так, ёсць людзі, якія сапраўды спрабуюць жыць па-новаму, але іх няшмат. Часцей за ўсё, калі папаўся адзін раз, будзе і другі. У арганізме нашага «кліента», дарэчы, аказалася 3,5 праміле алкаголю.

— Я заўсёды спрабую зразумець чалавека, пагутарыць з ім. Добра памятаю восеньскую ноч, калі мы з Максімам бабулю гадоў 80 ад суіцыду выратавалі. Жанчына сама з Бабруйска. З інтэрната для састарэлых яна збегла ў адных тапках і паліто. Чаму Мінск? Са сталіцай ва ўрадженкі Літвы звязаныя добрыя ўспаміны. Калісьці разам з нябожчыкам-мужам яны прыязджалі сюды і гулялі па парку імя Горкага. Вось менавіта там бабуля і збіралася звесці рахункі з жыццём, — расказвае Сняжана — Якія я толькі словы ні падбірала, якім тонам ні гаварыла, пакуль напарнік ціхенька падкрадваўся да жанчыны ззаду! І ведаеце, яна пачала не проста слухаць, а нават размаўляць са мною. У той момант я разумела, што, калі спатрэбіцца, скокну за ёй у ваду. На шчасце, не прыйшлося.

— Яе адвазе і вытрымцы і мужчыны могуць пазайздросціць. Але пры гэтым Сняжана не губляе сваёй жаноцкасці! Ведаеце, як яна добра гатуе? Мне часта смачныя піражкі перападаюць! А якое цудоўнае пачуццё гумару ў маёй напарніцы! — гаворыць Максім.

Было прыкметна, як пры словах калегі сяржант міліцыі Барычэўская пачала бянтэжыцца.

Сняжана расказала выпадак, які абурыў яе не столькі як супрацоўніка міліцыі, колькі як жанчыну. Летась, дзесьці ў ліпені, прыйшлося ратаваць дзіця. Маці пакінула хлопчыка ў машыне, а сама на дзве гадзіны сышла ў банк. Малога перадалі ўрачам — абышлося. Але твар маці, якая не адчувала сябе вінаватай, дзяўчына запомніць надоўга.

## Без лішніх акцэнтаў

— На абцасах не вельмі зручна ў нашай «карэце»? — гледзячы на мой абутак, кажа Сняжана. — Пра яркі манікюр, чырвоную памаду і распушчаныя валасы тут таксама лепей забыць. Часта чую ад «кліентаў»: «Жанчына не будзе мной камандаваць! Зусім з глузду з'ехалі: дзяўчыну на разборкі са здаровым мужыком пасылаюць! Гэта проста знявага!» і гэтак далей. Таму лішняя акцэнты на касметыцы тут непатрэбныя. А валасы не павінны закрываць пагоны. Таму ідэальная прычоска — хвост.

У жніўні Сняжана выходзіць замуж. Тут будзе ўсё па-дзявочаму: туфлі, фата, сукенка. Да свята амаль усё ўжо гатова. З будучым мужам Сняжана пазнаёмілася ў Пінску.

— Ён доўга не рашаўся да мяне падысці. Казаў, я вельмі сур'ёзная. Таму першы крок зрабіла я. Дапамагла яму, — жартуе дзяўчына.

Мінулым летам Сняжана заняла першае месца ў чэмпіянаце ГУУС Мінгарвыканкама па стральбе з табельнай зброі ў практыкаванні ЗМ-5. Дзяўчына сама не чакала такога выніку, але пасля ашаламляльнай перамогі вырашыла да спаборніцтваў у гэтым годзе падрыхтавацца яшчэ лепш. Захапляецца Сняжана таксама і паляваннем. На Палессі дачка і бацька не раз ладзілі сапраўдныя ўнутрысямейныя паядынкі.

Сняжана вельмі многа кажа пра чалавечнасць, адказнасць і падзяку. На працы, як і ў жыцці, без гэтага нікуды.

— Вельмі важна, каб у твае сілы паверыў настаўнік. Мне з Мікалаем Міхайлавічам Трапянюком пашчасціла. Ён спакойна адказваў на ўсе мае, часам нават і недарэчныя, пытанні, — дзеліцца Сняжана. — Вопытныя супрацоўнікі кажуць, што мой агонь у вачах згасне прыкладна праз гадоў дзесяць інтэнсіўнай працы. Маўляў, пакуль маладая, зялёная — працуй. Або мяне проста «з'есць» дэкрэт. І з першым, і з другім я паспрачалася б. Мы самі выбіраем тое, што нам сапраўды патрэбна. Зараз, напрыклад, я вельмі хачу стаць афіцэрам, — дзеліцца марамі дзяўчына.

На маё пытанне, ці цяжка жанчыне ў мужчынскай прафесіі, Сняжана адказала, што не бачыць той мяжы, якую ўсе малююць. Мабыць, у мастака фарбы дрэнныя? Або гавораць пра гэта толькі тыя, хто не працаваў з дзяўчынай-міліцыянерам, якая лічыць сваю справу прызваннем.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ДЗЕ НАЙБОЛЬШ СКЛАДАНА — НАПЕРАД ІДУЦЬ ЖАНЧЫНЫ

**Суботнім днём напярэдадні свята 8 Сакавіка Беларускі саюз жанчын ладзіць сустрэчу кіраўнікоў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў з усёй краіны, каб падзякаваць за іх нялёгкую працу і ўзнагародзіць за прафесійную самаадданасць. Адметнасць мерапрыемства ў тым, што яго гераіні — жанчыны, якія не адзін год стаяць на чале айчынных гаспадарак. У аграпрамысловым комплексе краіны прадстаўніцы выдатнай паловы чалавецтва займаюць амаль 100 кіруючых пасад.**

*— Сёння няма ніводнага кіраўніка, якому б лёгка працавалася, аднак найбольш складаная праца ў тых, хто займае пасады ў сельскагаспадарчай галіне. Там, дзе найбольш складана, заўжды наперадзе ідуць жанчыны. І напярэдадні свята мы вырашылі даць нашым кіраўніцам магчымасць крыху адпачыць ад клопатаў,* — агучыла ідэю сустрэчы **Рэгіна ДАВІДОВІЧ, намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын**. — *Пакуль не пачалася пасяўная, калі іх будзе проста не знайсці ў кабінетах, мы хочам падзякаваць за іх зусім не жаночую смеласць і вынослівасць. За тое, што яны ў такі нятросты час знаходзяцца на пярэднім краі барацьбы за ўраджай, вядуць за сабою працоўныя калектывы і робяць вялікі ўнёсак у сацыяльна-эканамічнае развіццё нашых сёлаў.*

Госці наведаюць музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і атрымаюць узнагароды і віншаванні ад міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніда Зайца і міністра працы і сацыяльнай абароны, старшыні БСЖ Марыяны Шчоткінай.

З цеплынёй выказвацца можна пра кожную з запрошаных жанчын, аднак ёсць асобы, якімі па праве можа ганарыцца ўся краіна, расказала Рэгіна Давыдовіч. Таццяна Струк, напрыклад, не толькі ўзначальвае ААТ «Атор» у Чачэрскім раёне, але і з'яўляецца членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Ужо 17 гадоў узначальвае СГК «Прывольны», што ў Слаўгарадскім раёне, Таццяна Кухарава. Гаспадарка знаходзіцца ў чарнобыльскай зоне, што робіць працу на зямлі яшчэ больш складанай, аднак кіраўніца спраўляецца на выдатна.

А ў Вольгі Луцык сёння асабістае свята. 4 сакавіка яна адзначыць роўна 44 гады на пасадзе старшыні гаспадаркі «Вялікі Двор» Стаўбцоўскага раёна. Як кажуць саслужыўцы, гаспадарыць яна вельмі ўмела і мае заслужаны аўтарытэт у людзей і дзяржавы.

Жанчына пра сваю працу кажа некалькімі словамі:

*— Я люблю сваю зямлю і сваіх людзей. Працаваць я пачала ў 1962-м, калі была яшчэ маладой дзяўчынай, а праз 10 гадоў узначаліла гаспадарку. Не магу сказаць, каб было вельмі цяжка. Калі ты са сваімі людзьмі — цэлым корпусам добрых спецыялістаў — складаеш адно цэлае, то і працаваць лёгка. Адзіная цяжкасць, што дзяцей я ніколі не бачыла. Ішла на працу — яны яшчэ спалі, прыходзіла — ужо спалі...*

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

## МІЛІЦЫЯНЕР ВЫРАТАВАЎ ДЗІЦЯ АД НАЕЗДУ

**Гэты выпадак віцебскі школьнік Мікіта запомніць надоўга. У выніку ўсё абышлося, але хто ведае, чым магло скончыцца...**

Набліжаўся вечар. Непадалёк ад вуліцы Будзёнага хлопчык пераходзіў дарогу. Два аўтамабілісты шлях яму саступілі, а трэці рухаўся па трамвайных пуцях і малога не бачыў. Дзякуй Богу, Сяргей Баталка, супрацоўнік Дэпартамента аховы, ішоў якраз за хлопцам і літаральна за долі секунд паспеў схапіць хлопца за ручку заплечніка, прыкрыць таго ад моцнага ўдара.

Як кажа Алена Гоман, старшы інспектар аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў Дэпартамента аховы МУС РБ, Сяргей Баталка, між іншым, бацька двух братоў-блізнятак, застаўся без значных траўмаў, хоць і атрымаў пашкоджанне галёнкі. Шасцікласнік не пацярпеў, адчуваючы сябе добра. А вось што да кіроўцы, ён так і не здолеў растлумачыць сваю спешку і быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.

**Якаў ЖУРБІН.** *taras@zviazda.by*

## ЯКІ РАСКЛАД НА СВЯТЫ?

**Як будуць курсіраваць цягнікі рэгіянальных ліній эканом-класа і гарадскіх ліній 5-8 сакавіка ў сувязі з пераносам працоўных дзён? Паводле інфармацыі прэс-цэнтра Беларускай чыгункі, наступным чынам.**

5, 6, 7, 8 сакавіка на ўчастку Мінск — Барысаў — Орша цягнікі рэгіянальных ліній эканом-класа будуць хадзіць цяперашнімі памерамі згодна з дзейным раскладам. 5 сакавіка курсіраванне цягнікоў рэгіянальных на ўчастках Мінск — Маладзечна, Мінск — Баранавічы, Мінск — Асіповічы будзе, як па рабочых днях, згодна з дзейным раскладам. 6, 8 сакавіка цягнікі на тых жа ўчастках будуць перавозіць пасажыраў як па нядзелях. 7 сакавіка на згаданых участках іх рух будзе арганізаваны, як па суботах.

5, 6, 7, 8 сакавіка курсіраванне цягнікоў гарадскіх ліній на ўчастках Мінск — Смалявічы, Мінск — Беларусь будзе весціся як па выхадных днях. 5, 6, 7, 8 сакавіка пасажыры цягнікоў рэгіянальных ліній эканом-класа на ўчастку Орша — Лепель мусяць карыстацца раскладам руху, як па рабочых днях.

5, 6, 7, 8 сакавіка для цягнікоў рэгіянальных ліній эканом-класа на ўчастках Маладзечна — Гудагай, Маладзечна — Круляўшчызна, Маладзечна — Ліда будзе дзейнічаць расклад як па выхадных днях.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ПАСПЕЦЬ ЗА ЧАСАМ

## ХТО ПАЧЫНАЕ РАНІЦУ З «РАДЫЁФАКТАМ» — ТОЙ У ЦЭНТРЫ ПАДЗЕЙ

**4 сакавіка адзначае сваё 25-годдзе інфармацыйна-аналітычная праграма «Радыёфакт» Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё.**

**Вось ужо чвэрць стагоддзя праект задае тон дня аператыўнымі, аб'ектыўнымі і кампетэнтнымі навінамі. Па буднях у рэжыме анлайн з сямі да васьмі раніцы ў эфіры нас чакаюць афіцыйная хроніка, каментарыі спецыялістаў, спецыяльныя рэпартажы, эксклюзіўныя інтэрв'ю, навіны бізнесу, культуры, спорту і шмат іншай карыснай інфармацыі. Як адзначае намеснік галоўнага дырэктара Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё Алена Давідовіч, «Гісторыя «Радыёфакта» — гэта ўжо пяць пакаленняў аўтараў і вядучых. І галоўны прынцып іх працы — паспяваць за часам, быць у цэнтры падзей і любіць і паважаць сваіх слухачоў». Мы пацікавіліся ў сённяшніх вядучых праграмы, якія 5 фактаў вылучаюць гэты праект сярод іншых і як яму ўдаецца заставацца актуальным і запатрабаваным столькі гадоў.**



***Аляксандр Шустэр (на 1-м канале з 2011 года, вядучы «Радыёфакта» са студзеня 2015):***

1. Добра памятаю тыя часы, калі праграма толькі пачала выходзіць на радыё. У нас у кватэры працавала радыёкропка, і дзень пачынаўся не толькі са сняданка, але і з «Радыёфакта».

2. Я, збіраючыся ў школу, слухаў навіны, рэпартажы і музыку (тады яшчэ была і музыка), бадзёрыя галасы вядучых.

3. Тады і ўявіць не мог, што аднойчы сам сяду за мікрафон; а знаёмыя мне вядучыя стануць маімі калегамі і хтосьці, займаючыся ранішнімі клопатамі, будзе слухаць мяне. Калі ўпершыню апынуўся перад мікрафонам «Радыёфакта», то адчуваў хваляванне, адказнасць, хоць да гэтага меў вялізны вопыт працы ў прамым эфіры. Упэўненасці ў сабе прыдавала давер калег і кіраўніцтва.

4. Праца ў праграме ўплывае не толькі на тое, што ваш дзень пачынаецца вельмі рана, але накладвае свой адбітак у большай ступені на вечар напярэдадні эфіру. Бо неабходна выбраць самыя цікавыя навіны, размеркаваць сюжэты па блоках праграмы. Ну і, зразумела, раней легчы спаць, бо вядучага чакае ранні пад'ём.

5. Увогуле люблю працаваць менавіта раніцай. І сам дагэтуль зранку ўключаю радыё, каб даведацца пра навіны, не адцягваючыся на тэлекарцінку.



***Максім УГЛЯНІЦА (у праграме працуе 10 гадоў):***

1. **У «Радыёфакце» — самае дакладнае надвор'е!** Канешне, мы не можам даць 100-працэнтную гарантыю, што будзе дождж ці наадварот. Зрэшты, такую гарантыю не дадуць і сіноптыкі. Але менавіта ў нашай праграме вы можаце пачуць найбольш падрабязны і дакладны прагноз надвор'я, што называецца, з «першых вуснаў» ад спецыялістаў Гідраметцэнтра. А вось калі вы пачулі ў эфіры кароткі прагноз з нейкіх незразумелых інтэрнэт-сайтаў і ў выніку прыйшлі на працу мокры, то задайце сабе пытанне: ці тое радыё вы слухаеце?

2. **Толькі ў «Радыёфакце» — гадзіна інфармацыі без музыкі!** Кожны будны дзень мы працуем над тым, каб гэта была гадзіна толькі самай важнай, карыснай і цікавай інфармацыі. Хтосьці скажа: гадзіна — занадта шмат! Для гэтага мы «разбілі» праграму на чатыры ўмоўныя блокі, з кароткім перапынкам на рэкламу і надвор'е. Кожны блок — як завершаны інфармацыйны выпуск. Калі вам больш цікавая палітыка і эканоміка, міжнародныя навіны — слухайце нас у першай палове гадзіны. Калі цікавяць навіны сацыяльнага жыцця, культура, спорт — мы раскажам пра гэта ў другой палове. Аднак калі Мінск зноў прыме чэмпіянат свету па хакеі або беларускі ўдзельнік пераможа на «Еўрабачанні» — канешне, «Радыёфакт» будзе пачынацца з гэтых навін!

3. **Вы можаце слухаць праграму, калі пажадаеце і дзе пажадаеце!** У свой час мы назвалі гэты медыяпраект «Ад Радыёфакта да Радыёфакта». Кожны дзень свежая праграма практычна адразу пасля эфіру з'яўляецца на нашым сайце www.radio1.by. Таму ўвесь дзень у любы час і ў любой кропцы зямнога шара (галоўнае, каб там быў інтэрнэт) вы можаце паслухаць ці праслухаць важную для вас інфармацыю. Або проста пачуць родную беларускую мову, знаходзячыся, напрыклад, у Аўстраліі.

4. **Мы ствараем радыёлетапіс жыцця незалежнай Беларусі!** У маім прафесійным жыцці на сёння было каля 730-ці «Радыёфактаў». Падлік прыблізны, бо тэксты першых выпускаў, у якіх я быў вядучым, на жаль, не захаваліся. Але днямі дзеля цікаваcці вырашыў паглядзець — а пра што ж мы расказвалі ў «Радыёфакце» прыкладна ў гэтыя ж дні, толькі 10 гадоў таму? Адкрыў тэкст аднаго з выпускаў са свайго «архіва». Беларусь адзначала Сусветны дзень касманаўтыкі. Стварыла свой першы нацыянальны спадарожнік. Успамінала сваіх касманаўтаў — Пятра Клімука і Уладзіміра Кавалёнка... І раптам разумею: дык мы ж толькі напярэдадні размаўлялі ў студыі праграмы з вучонымі пра першы беларускі спадарожнік дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, які ўжо чатыры гады працуе на нас у космасе. Пра другі, што рыхтуецца яму на змену. І пра нядаўна запушчаны спадарожнік сувязі. А ў раздзеле «нашы ў космасе» цяпер яшчэ адно прозвішча — Алег Навіцкі. Вось так незаўважна мінула 10 гадоў! А ўвесь гэты час дзень за днём «Радыёфакт» быў і застаецца своеасаблівым летапісам жыцця краіны.

5. **«Радыёфакт» слухаюць усе!** Безумоўна, я маю на ўвазе не колькасны склад аўдыторыі (пакуль, прызнаемся, мы не можам запісаць сабе ў актыў усе 9 з паловай мільёнаў беларусаў, якія пачынаюць раніцу з нашай праграмы), а якасны. «Радыёфакт» слухаюць усе — ад міністраў да рабочых, ад прафесараў да прыбіральшчыц. Прычым гэта не проста прыгожы вобраз, а канкрэтныя гісторыі сустрэч, часам нечаканых, са сваімі слухачамі. У вядучых праграмы такіх гісторый ёсць хіба не дзясяткі. І кожны з гэтых слухачоў для нас каштоўны — незалежна ад таго, якую пасаду ён займае, або балельшчыкам якой футбольнай каманды з'яўляецца. З маіх асабістых нядаўніх сустрэч — урач «хуткай дапамогі» і супрацоўнік станцыі тэхагляду аўтамабіляў. І хоць першых хацелася б бачыць як мага радзей, а другія нічым не дапамогуць — усё роўна прыемна!



***Вольга СЯМАШКА (вядучая «Радыёфакта» з 2009 года):***

1. **Традыцыйнасць.** Не адно пакаленне беларусаў прывыкла ўставаць з шасцігадзінным гімнам па радыё і пачынаць дзень з галоўнай нашай праграмай «Радыёфакт». Вось ужо 25 гадоў кожную раніцу з 7 да 8 мы расказваем пра асноўныя падзеі ў краіне і ў свеце. Штогод у нашым эфіры з'яўляюцца новыя праграмы, іншыя знікаюць, змяняецца час выхаду ў эфір, але «Радыёфакт» гэтыя змены не закранаюць. Я рада, што змагла далучыцца да каманды праграмы спачатку ў якасці карэспандэнта, а потым стала вядучай.

2. **Адказнасць.** Праграма, па якой пазнаюць Беларускае радыё, проста павінна быць самай лепшай. Таму мы вельмі адказна падыходзім да ўсяго: выбару тэм, напісання тэкстаў для вядучага і якасці гучання сінхронаў у рэпартажах.

3. **Пазнавальнасць.** Для мяне яна ў фразе: «Гэта вы тая Вольга Сямашка, якая вядзе Радыёфакт?»

4. **Зваротная сувязь.** Безумоўна, у праграмы ёсць свае прыхільнікі. Адна такая слухачка тэлефануе перыядычна адразу пасля праграмы і кажа: Вольга, сёння праграма была цудоўная, асабліва зачапіў такі-такі сюжэт, перадайце аўтару «дзякуй». Памятаю, як рабіла для «Радыёфакта» інтэрв'ю з дырэктарам цэнтра дзіцячай анкалогіі Вольгай Алейнікавай і сярод іншага яна расказала, што цэнтру патрэбны мікрааўтобус, каб перавозіць маленькіх пацыентаў. Гэтую праграму пачула кіраўніцтва Нацыянальнага банка і дапамагло.

5. **Справы сямейныя.** Калі я раніцай у эфіры, мае родныя, асабліва бабулі, ведаюць: са мной усе ў парадку. А як толькі яны не чуюць мяне, адразу пачынаюць тэлефанаваць і пытацца, што здарылася і хто захварэў.

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*



***Павел ЛАЗОВІК (працуе ў праграме 10 гадоў):***

1. Толькі ў нашай праграме вас чакае метэапрагноз ад Дзмітрыя Рабава 5 разоў на тыдзень.

2. Для таго, каб у нашых слухачоў была магчымасць збірацца на працу і слухаць аператыўныя навіны, вядучы прачынаецца а 4.30 раніцы (выходзіць з дому а 5-й).

3. Кожную раніцу ў нас гучыць «голас рэгіёнаў», дзякуючы таму што створана карэспандэнцкая сетка па ўсёй Беларусі.

4. Праграма з'яўляецца адзіным праектам на радыё, у якім часцей за ўсё сустракаюцца словы «Сёння адбудзецца», таму што ў эфіры — інфармацыя надзвычайнага дня.

5. Для мяне «Радыёфакт» — гэта пульс жыцця Беларусі. І як вядучы я неверагодна радуюся, калі адбываецца шмат падзей. Тады менавіта ты спяшаешся першым расказаць пра іх кожнаму.



***Алена ВАХРАМЕЕВА (у праграме — 5 гадоў):***

1. Быў выпадак, калі я тэлефанавала ў сіноптыкам, пытаюся прагноз і мне кажуць, што «сёння ў нас сонечна, без ападкаў», гляджу ў акно — а там ідзе дождж. З гэтага ўзнікла ідэя зрабіць асобную праграму «Пра надвор'е і не толькі». Мы зрабілі яе, каб вось такія факты выпадковасці тлумачыць слухачам.

2. Калі не знаходжуся каля мікрафона, але ёсць магчымасць слухаць «Радыёфакт», — абавязкова гэта раблю.

3. Форс-мажоры ў эфіры ў нас амаль што адсутнічаюць. Рыхтуючыся да эфіру я, як і мае калегі, напярэдадні збіраю навіны. Здараецца і так, што ў апошні момант з'яўляецца інфармацыя больш актуальная, чым адабраная напярэдадні. Аднак гэта ўплывае толькі на вёрстку праграмы, але не на яе змест.

4. Праца ў праграме прывучыла да хуткіх збораў. І гэта вельмі дапамагае. Я «сава», і для мяне самая вялікая складанасць — рана ўстаць. Але дзякуючы «Радыёфакту» я раніцай магу сабрацца за 12 хвілін і паехаць на працу.

5. Актуальнасць нашай праграмы, на маю думку, базіруецца перш за ўсё на надзённасці тэм, якія здольны зацікавіць шырокую аўдыторыю. Бываюць выпадкі, што пасля выхаду «Радыёфакта» нам тэлефануюць людзі і дзякуюць за закранутую тэму.




## Аўторак, 8 сакавіка

### Беларусь 1

**7.35 Камедыя «Пра што маўчаць дзяўчаты».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10, 1.05 Серыял «Два бацькі і два сыны».**
**10.55 Камедыя «З 8 Сакавіка, мужчыны!».**
**13.10 Камедыя «Паласаты рэйс».**
**15.10 Камедыя «8 першых спатканняў».**



**16.55 Камедыя «Абрабаванне па-жаночаму».**
**21.00** Панарама.
**21.40 Камедыя «8 новых спатканняў».**
**23.10 Меладрама «Страшная прыгажуня».**
**0.55** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00, 21.05** Тэлебарометр.
**7.05, 22.05** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
7.30 Анімацыйны фільм «Воблачна, магчымы ападкі ў выглядзе фрыкадэлек».
9.00 Анімацыйны фільм «Воблачна...2: Помста ГМА».
**10.00, 12.00, 13.00, 15.00, 18.00, 19.00** «Найлепшы дзень на «Двойцы!» Тэлемарафон.
**11.05 Меладрама «Д'ябал носіць «Prada».**
**13.50 Меладрама «Спадарыня пакаёўка».**
**16.10 Драма «Аўстралія».**
**19.45 Меладрама «Турыст».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. «Рэал» — «Рома». Матч у адказ.
**0.45 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабрананак».
**7.35, 10.35, 13.15, 17.40, 23.30** «Калейдаскоп».
**7.50 «Дзяўчына з характарам». Камедыя.**
**9.10 «Кітайская бабуля». Камедыя.**
**10.50** «Гітара па крузе». Аўтар-выканаўца Галіна Хомчык.
**11.50 «Зімовая вішня». Меладрама.**
**13.30** «Кіно і час». Аднаўленне Мінска. Летапіс.
**14.10 «Апошняе каханне місіс тара Моргана». Драма.**
**16.05** «Вясна ў Маладзечне». Святочны канцэрт да Дня жанчын.
**17.55** «Камертон». Заслужаная артыстка Расіі Алена Якаўлева.
**18.20 «Экіпаж». Драма.**
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Дазвольце расказаць!» Аляксандр Саладуха.
**21.15** «Гэта шчасце». Спявае Аляксандр Саладуха.
**22.20 «Мы зрабілі гэта!» Камедыя.**

### Беларусь 5

**7.35** PRO спорт. Вынікі.
**8.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**8.55** Спартыўная гімнастыка. Кубак свету. Нью-Ёрк.
**11.00** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. 1/2 фіналу. Першы матч.
**12.55** Біятлон. Чэмпіянат свету. Халменколен. Спрынт. Мужчыны.
**14.25** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. 1/2 фіналу. Першы матч.
**16.40** Біятлон. Чэмпіянат свету. Халменколен. Спрынт. Жанчыны.
**18.15** «Спорт, спорт, спорт». Ірына Шылава.
**18.45** Спорт-кадр.
**19.15, 22.25** PRO спорт. Навіны.
**19.25** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**19.55** Гандбол. SEHA-ліга. «Заграб» — БГК імя Мяшкова.
**21.35** «Нашы». Уладзімір Самсонаў.
**21.50** «Місія — Рыа». Відэачасопіс.
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Вольфсбург» — «Гент».

### АНТ

**7.00, 8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**7.05** «Наша раніца».
**9.05 Камедыі Леаніда Гайдая «Самагоншчыкі», «Сабака Барбос і незвычайны крос».**
**9.55** Кіно ў колеры. Камедыя «Прыходзьце заўтра».
**11.45 Маст. фільм «Вышыня».**
**13.25 Камедыя «Дзяўчаты».**
**15.15, 16.15** Кіно ў колеры. Маст. фільм «Вясна на Зарэчнай вуліцы».
**16.10, 20.55** Навіны спорту.
**17.15 Камедыя «Каханне і галубы».**
**19.10, 21.00** Юбілейны вечар Раймонда Паулса.
**22.20 Трылер «У кожнага свая хлусня».**
**23.55 Маст. фільм «У чаканні выдыху».**

### СТБ

**6.10** «Нам і не снілася»: «І стварыў Бог жанчыну...»
**8.25 Меладрама «Салодкая жанчына».**
**10.10, 15.50** «Легенды СССР».
**12.00, 1.10 Камедыя «Дзе знаходзіцца «нофелет»?».**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40 Маст. фільм «Шакалад».**
**16.40** «Самая карысная праграма».
**17.35** «Дарагая перадача».
**17.55 Меладрама «Закаханы па ўласным жаданні».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.05 Меладрама «Кейт і Леа».**
**22.10** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**22.30** «Аўтапанарама».
**22.50** «Сакрэты старажытных прыгажунь».

### МІР

**6.00** М/ф.
**8.20 Маст. фільм «Формула кахання».**
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Маст. фільм «Пунсовыя ветразі».**
**11.45 Маст. фільм «Рымскія канікулы».**
**14.00 Маст. фільм «Буркун».**
**16.15 Маст. фільм «Зіта і Гіта».**
**19.15 Маст. фільм «Па сямейных абставінах».**
**21.45 Маст. фільм «Незвычайныя прыгоды Адэль».**
**23.50 Серыял «Пелагія і белы бульдог».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Салодкая жанчына».**
**9.20 Маст. фільм «Люблю 9 сакавіка!».**
**10.40 Маст. фільм «Каханне з выпрабавальным тэрмінам».**
**14.00, 20.00** Весткі.
**14.25** «Пра што спяваюць мужчыны».
**16.10 «Ха». Маленькія камедыі.**
**16.40 Маст. фільм «Гаспадыня вялікага горада».**
**20.30** «Танцы з зоркамі».
**22.45 Серыял «Дзённік свекрыві».**

### НТБ—Беларусь

**6.25** «Астрапрагноз».
**6.30 Серыял «Муж і жонка».**
**8.00, 10.00, 13.00, 19.00** Сёння.
**8.20, 10.25 Серыял «Святло і цень маяка».**
**12.00** «Ежа жывая і мёртвая».
**13.20** «Паедзем, паядзім!»
**14.05 Серыял «Марскія д'яблы. Лёсы».**
**15.45** «Люстэрка для героя».
Гала-шоу.
**18.15** «Гаворым і паказваем». Спецвыпуск да 75-годдзя з дня нараджэння Андрэя Міронава.
**19.25** «Усе зоркі для каханай». Святочны канцэрт.
**21.00 Маст. фільм «Я — Ангіна!»**

### 8 канал

**7.00, 14.10, 19.45, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.50 Серыял «Песня лёду і полымя».**
**8.30, 18.30 Серыял «Наложніца».**
**9.35, 12.55, 13.55, 15.45, 16.45, 18.25, 19.35, 20.55** «Хатняя крама».
**9.45** «Мой любімы гадаванец».
**10.15** Дак. фільм «Лік Царыцы нябеснай».
**11.00 Драма «Блаславіце жанчыну».**
**13.00 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
**14.15 Серыял «Каханне і страх».**
**16.30** «Кінаблакнот».
**17.00 Камедыя «Формула кахання».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Драма «Над узроўнем неба...».**
**23.15 Серыял «Крык».**

---

### ВТБ

**6.00, 4.30** «Лаві момант».
**6.30, 8.15** «Ералаш».
**6.45** М/ф «Пінгвіняня Парапо».
**7.15** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.45** Камедыя «Пра што маўчаць дзяўчаты».
**10.30, 23.10** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**11.00, 2.30** Камедыя «Утаймаванне свавольнага».
**13.15** «Уральскія пельмені». Жаночае: — Шчас Я!
**15.45** «Уральскія пельмені». АДАМ у добрыя рукі.
**18.00, 0.00** «Уральскія пельмені». Прыгажосць выратуе МЫМР.
**19.30, 1.15** «Уральскія пельмені». З мілым РАЙ і ў буціку.
**21.00** Камедыя «З 8 Сакавіка, мужчыны!».
**5.00** «Турбаміксер».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Чаму смяецеся? або Класікі жанру».
**10.55** «Сэрцы чатырох». Маст. фільм.
**12.25** «Больш чым каханне». Валянціна Сярова і Канстанцін Сіманаў.
**13.10** «Холад». Дак. серыял.
**13.50** «Стынг. Калі адыходзіць апошні карабель». Канцэрт у тэатры Джозэфа Папа.
**15.20** 75 гадоў з дня нараджэння Андрэя Міронава. «Глядзіце, я гуляю...» Дак. фільм.
**16.00** Андрэй Міронаў, Анатоль Папанаў, Вера Васільева, Аляксандр Шырвінт у спектаклі тэатра Сатыры «Рэвізор». Запіс 1982 года.
**19.00** «Рамантыка рамансa». Гала-канцэрт.
**20.30** «Андрэй Міронаў. Брава, Артыст!» Кінаканцэрт.
**20.55** З «Залатога» фонду айчыннага тэлебачання. Андрэй Міронаў у канцэртнай студыі «Астанкіна». Запіс 1978 года.
**22.40** Кіно на ўсе часы. «Ісус Хрыстос — суперзорка». Маст. фільм.
**0.30** «Чаму смяецеся? або Класікі жанру».
**1.20, 2.40** Сусветныя скарбы.
**1.35** «Фільм, фільм, фільм». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Скарб Сценькі Разіна».

### Настальгія

**6.00** «Акулы пяра». Гурт «Ногу свело».
**6.45, 8.15, 8.45, 9.30, 11.30, 12.55, 14.50, 15.40, 17.00, 18.50, 20.50, 21.40, 23.00, 1.15, 2.25, 5.00** Музычная настальгія.
**7.00** «Зямля—Паветра». Рыгор Лепс.
**8.30** Дак. фільм «Мода 91-92».
**9.00** Дак. фільм «Аляксандр Разенбаум. Твар у твар».
**10.00** Маст. фільм «Дзікі сабака дзінга».
**12.00** Дак. фільм «Выбары-96. Страсці па ўладзе».
**13.20** Маст. фільм «Старая, старая казка».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**18.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Андрэй Міронаў.
**19.20** Маст. фільм «Я вас кахаў...»
**0.00** «Зямля—Паветра». Гурт «Розныя людзі». 2003 год.
**1.30** Фільм-канцэрт «Рабіна на канькаху». 1989 год.
**2.45** М/ф «Зязюля і шпак».
**3.00** «Быў час». 2009 год.
**4.00** Маст. фільм «Ішоў сабака па раялі».

### EuroSport 1

**3.00, 5.00, 10.00, 15.15** Біятлон. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
**3.30, 8.00, 13.15, 22.00, 0.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**5.30, 9.15, 12.30, 20.00, 1.50** Біятлон. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**6.00, 10.30, 21.00, 2.30** Веласпорт. Парыж — Ніца.
**7.00, 14.15** Зімовыя віды спорту.
**11.30, 12.25** Футбол. Еўрагалы.
**11.35** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты.
**12.00** Футбол. Яго Вялікасць футбол.
**16.00** Снукер. Сусветнае Гран-пры.
**22.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету.

### Камедыя

**0.45** Камедыя «Таксі 2».
**2.15** Камедыя «Шосты элемент».
**4.00** Меладрама «Шчаслівае сямейства».
**5.35, 21.30** Камедыя «Таксі 4».
**7.10** Меладрама «Назад да шчасця, або Хто знойдзе сінюю птушку».
**9.00** Камедыя «Падарунак з характарам».
**10.30** Камедыя «Пенелопа».
**12.20** Камедыя «Кактус».
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Меладрама «Круты паварот».
**18.00** Камедыя «Кахаю тваю жонку».
**19.40** Камедыя «Любоўь-морковь».
**23.05** Камедыя «Махляры».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.25** «Знесеныя ветрам». Драма.
**13.30, 4.00** «Мужчына і жанчына. Адчуйце розніцу». Дак. фільм.
**15.00** «Прыгажуня і пачвара». Анімацыйны фільм.
**16.30, 1.00** «Час кахаць». Меладрама.
**20.15** «Тытанік». Меладрама.
**23.35** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**5.15** «Нераскрытыя тайны».

### ТБ1000

**6.00, 16.10** Меладрама «Цяжкасці перакладу».
**8.10, 3.55** Баявік «Шпіёнскія гульні».
**10.20, 2.15** Камедыя «Як выкрасці дыямент».
**12.10** Драма «Філамена».
**14.00** Драма «Мех: Уяўны партрэт Дзіяны Арбус».
**18.00** Драма «Дзіяна: Гісторыя кахання».
**20.00** Трагікамедыя «Моцная жанчына».



**22.15** Меладрама «Каханне з перашкодамі».
**0.10** Меладрама «Джэйн Эйр».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.20** Камедыя «Неваляшка».
**8.20, 4.20** Меладрама «Жаніх па аб'яве».
**10.20** Драма «Дачка».
**12.20** Старое добрае кіно. Трагікамедыя «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца».
**14.20** Меладрама «З 8 Сакавіка, мужчыны!»
**16.20, 2.20** Камедыя «Гарка! 2».
**20.20** Камедыя «Поўнае перотварэнне».
**22.20** Меладрама «Восьмае сакавіка».
**0.20** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... бацька нявесты».

### National Geographic

**6.00, 7.10, 21.00, 0.50, 4.00, 5.35** Гульні розуму.
**6.20** Займальная навука.
**8.00, 21.45, 1.40, 4.50** Чалавек супраць YouTube.
**8.50, 12.00, 13.40, 19.25** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**9.40, 14.25, 20.10, 22.30, 3.10** Расследаванні авіякатастроф.
**10.30** Дзікі тунец.
**11.15** Ледзяная дарога.
**12.50, 0.05** Зрабі або памры.
**13.15, 0.30** Навуковыя недарэчнасці.
**15.10** Інстынкт выжывання.
**16.00** Па слядах міфічных пачвараў.
**16.45** Суперзбудаванні Трэціга рэйха.
**17.30** Я — Малала.
**19.00** Тайны гісторыі.
**23.20** Паранармальнае.
**2.30** Эвакуацыя Зямлі.

### Discovery

**8.00, 12.30** Хуткія і гучныя.
**8.50** Што было далей?
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10,14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Багажныя войны.
**11.35, 7.10** Драпежнікі буйным планам.
**13.25, 6.25** Забойныя дылемы.
**15.15, 5.40, 1.00** Страсць да маторaў.
**16.10, 3.00** Вялікі махінатар.
**18.00** Мужчыны, жанчыны, прырода.
**19.00** Зорнае выжыванне.
**20.00** Востраў.
**22.00** Таргі без тармазоў.
**23.00** У пагоні за класікай.
**0.00** Праз любоў да машын.
**2.00, 4.50** Бітва за нерухомасць.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

---

## ГУЛЯЕМ З УДАЧАЙ ПА ПАНЯДЗЕЛКАХ

**Латарэя «Суперлато», розыгрышы якой раней былі прадстаўлены ў эфіры тэлеканала «Беларусь 2» па нядзелях, з сакавіка пачне выходзіць па панядзелках у 19.15.**

«Суперлато» — гэта не толькі займальная гульня і выдатная магчымасць ажыццявіць свае мары, але і яркае шоу, якое суправаджаецца выступленнямі эстрадных выканаўцаў, вядомых артыстаў і танцораў. Гледачы маюць магчымасць назіраць за ходам гульні і адначасова атрымліваць асалоду. Першы вясновы выпуск «Суперлато» па новым раскладзе з'явіцца ў эфіры 7 сакавіка ў 19.15. А глядзець розыгрышы латарэі можна падчас эфіру на тэлеканале «Беларусь 2» альбо анлайн на сайце тэлеканала www.belarus2.by.

## «ПІН_КОД» РАЗДАЕ БОНУСЫ

**У новым тэлесезоне гледачоў тэлеканала «Беларусь 2» чакае шмат сюрпрызаў, адзін з іх — выхад праекта «ПІН_КОД» у прамым эфіры. Што дазваляе гледачам кантактаваць з гасцямі ў студыі праграмы практычна «face to face».**

«ПІН_КОД» — праект пра тое, што хвалюе і цікавіць маладое пакаленне. Гэтая праграма — пляцоўка для творчасці, на якой кожны можа заявіць пра сябе. Адметная рыса — гнуткасць: праграма лёгка трансфармуецца, прычым з улікам пажаданняў і пераваг гледачоў, якія цяпер, дзякуючы «жывому» фармату, сталі яшчэ бліжэйшымі да тэлеэфіру. З'явілася значна больш магчымасцяў для інтэрактыву: усё адбываецца тут і цяпер!

Праект дазваляе гледачам сумяшчаць карыснае з прыемным. І для гэтага варта праяўляць актыўнасць у афіцыйнай групе праграмы — vk.com/pin_kod2015 — дзяліцеся сваімі думкамі з вядучымі, выбірайце гасцей выпускаў, задавайце пытанні, якія вас цікавяць, і ўплывайце на ход падзей у студыі. А ў дадатак — атрымлівайце падарункі!

У розыгрышах прызоў, напрыклад, можна займець квіткі на нашумелую кінапрэм'еру, на спектакль з удзелам вядомых акцёраў ці на модную вечарыну, магчымасць сустрэцца з кумірам ці стаць уладальнікам навамоднага гаджэта. У кожным выпуску будзе новы бонус. Адсочвайце інфармацыю ў афіцыйнай групе праекта, дзе абазначаюцца тэмы і ўмовы розыгрышу, а прызы чакаюць сваіх уладальнікаў!

Акрамя гэтага, у абноўленым фармаце «ПІН_КОДа» гледачы ўжо паспелі заўважыць з'яўленне новай рубрыкі Start Up. Парады прафесіяналаў, кансультацыі экспертаў, складанне бізнес-плана — аўтары праграмы вырашылі дапамагчы амбіцыйным маладым людзям, якія хочуць адкрыць свой бізнес, але не ведаюць як. З чаго пачынаць, пра што паклапаціцца ў першую чаргу, дзе ўзяць пачатковы капітал — бясплатныя майстар-класы ад сапраўдных гуру бізнесу глядзіце ў праекце.

Для тых, хто цікавіцца камп'ютарнымі гульнямі, у рубрыцы «Top-J» прадстаўлены займальныя агляды навінак, цікавыя факты і многае іншае. Яркім элементам праграмы стала рубрыка «МПД» (маладыя, паспяховыя, дзёрзкія), назва якой гаворыць само за сябе. Крэатыўныя прадстаўнікі моладзі, лідары, якія ўжо заявілі пра сябе і змаглі дабіцца высокіх вынікаў, тыя, з каго можна і трэба браць прыклад — героі сюжэтаў.

Нагадаем, праграма «ПІН_КОД» выходзіць у прамым эфіры мадзёжнага канала «Беларусь 2» чатыры разы на тыдзень, з аўторка па пятніцу ў 15.30. Паўторы — у 23.10. Глядзець праект можна таксама анлайн на сайце www.belarus2.by/.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

## Серада, 9 сакавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.25** Зона Х.
**9.10 Камедыя «8 новых спатканняў».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00 Серыял «Думай як жанчына».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Паміж намі дзяўчынкамі».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 23.45** Сфера інтарэсаў.
**20.00 Серыял «Каманда 8». 1-я серыя.**
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.05 Серыял «След».**
**0.20** Дзень спорту.
**0.35 Серыял «Пастка».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 19.55** Тэлебарометр.
**9.10, 22.05** «Анлайн». Скетчкам.
**9.45, 16.20 Трылер «Закрытая школа».**
**10.55 Меладрама «Джулі і Джулія: Гатуем шчасце па рэцэпце».**
**13.10** Капейка ў капейку.
**13.50** Анімацыйны фільм «Настасся».
**15.30, 22.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.35 Серыял «Вароніны».**
**18.45 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**20.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. «Зеніт» — «Бенфіка». Матч у адказ.
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.40 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

**0.25** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**0.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матчы ў адказ. Агляд.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 13.05, 15.55, 18.15, 23.50** «Калейдаскоп».
**7.50, 16.10** «Размаўляем па-беларуску».
**8.00 «Апошняе каханне містэра Моргана». Драма.**
**9.50** «Святыні Беларусі».
**10.20 «Экіпаж». Драма.**
**12.35** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Івана Дмухайлы.
**13.20 «Мы зрабілі гэта!» Камедыя.**
**14.30** «Дазвольце расказаць!» Аляксандр Саладуха.
**14.45** «Гэта шчасце». Спявае Аляксандр Саладуха.
**16.15 «Сто дзён пасля дзяцінства». Кінааповесць.**
**17.45** «Дыя @ блог». «Пра прыгожае».
**18.35, 21.00** «Героі і ахвяры халоднай вайны». Бурбон, бомба і адстаўка галоўкама. Дак. фільм.
**19.15 «Хлопец з нашага горада». Драма.**
**20.40** «Калыханка».
**21.40 «Чакаю і спадзяюся». Драма.**

### Беларусь 5

**7.35, 19.15, 22.25** PRO спорт. Навіны.
**7.50** Баскетбол. НБА. «Мінесота» — «Сан-Антоніа».
**9.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Вольфсбург» — «Гент».
**11.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Рэал» — «Рома».
**13.20** Спорт-кадр.
**13.50** Гандбол. SEHA-ліга. «Заграб» — БГК імя Мяшкова.
**15.20** Біятлон. Чэмпіянат свету. Халменколен. Гонка пераследу. Мужчыны.
**16.10** Біятлон. Чэмпіянат свету. Халменколен. Гонка пераследу. Жанчыны.
**17.05** Козел пра футбол.
**17.25** Біятлон. Чэмпіянат свету. Халменколен. Індывідуальная гонка. Жанчыны.
**19.25** Хакей. Белнафтахім — чэмпіянат Беларусі. 1/2 фіналу. Першы матч.
**21.35** «Нашы». Віталь Рудакоўскі.
**21.50** Слэм-данк.
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Чэлсі» — ПСЖ.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Камедыя «Каханне і галубы».**
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Маст. фільм «Тальянка».**
**22.55 Серыял «Батальён».**
**0.50** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Меладрама «Закаханы па ўласным жаданні».**
**10.00** «Цэнтральны рэгіён».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50 Маст. фільм «Давайце патанцуем».**
**15.45** «Вадзіць па-руску».
**16.05** «Аўтапанарама».
**16.50** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**17.10** «Ведай нашых!»
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00** «Тайны Чапман».
**23.55** «Разумней не прыдумаеш з Міхаілам Марфініным».
«Сезон цудаў».
**0.55 «Баец». Серыял. Заключныя серыі.**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Медыцынская праўда».
**9.30 Маст. фільм «Зіта і Гіта».**
**12.30** «Зроблена ў СССР».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Вой, мамачкі!»
**13.45, 2.55 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**14.15, 20.15 Серыял «Развод».**
**15.10, 3.25** «Справы сямейныя».
**16.20** «Сакрэтныя матэрыялы».
**16.50** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**17.20, 19.20 Серыял «Хто, калі не я?».**
**21.05 Маст. фільм «Халоднае сонца».**
**23.00 Серыял «Кароткі курс шчаслівага жыцця».**
**23.55** Галоўная тэма.
**0.10** Ток-шоу «Слова за слова».
**1.05 Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў».**
**4.15 Серыял «Два бакі адной Ганны».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**11.50** Святочнае шоу Валянціна Юдашкіна.
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Касатка».**
**19.10, 20.55 Серыял «Гюльчатай».**
**22.00, 23.10 Серыял «Дзённік свекрыві».**
**0.35** «Спецыяльны карэспандэнт».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Святло і цень маяка».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Месца сустрэчы».
**15.00** «Люстэрка для героя».
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.50 Серыял «Пчаляр».**
**21.30, 23.00 Серыял «Бамбіла. Працяг».**
**22.30** «Вынікі дня».

### 8 канал

**7.00, 14.10, 19.45, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 20.00 Серыял «Песня лёду і полымя».**
**8.25, 9.35, 13.55, 15.45, 16.25, 18.05, 19.50, 21.00** «Хатняя крама».
**8.30, 18.15 Серыял «Наложніца».**
**9.40** Дак. фільм «Восьмы стоўп Расіі».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Камедыя «Утаймаванне свавольнага».**
**13.00 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
**14.15 Серыял «Каханне і страх».**
**16.40 Драма «Каўказская рулетка».**
**18.15 Серыял «Наложніца».**
**19.20** «Мой любімы гадаванец».
**20.55** «Вечарніца».
**21.10 Трылер «Мінулае не адпускае...».**
**23.10 Серыял «Крык».**

### ВТБ

**6.00, 17.00, 0.00, 4.30** «Лаві момант».
**6.30, 23.05** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 13.20** «Ералаш».
**8.30** «Кіно ў дэталях».
**9.30** Прыгоды «Неверлэнд».
**14.00** Камедыя «З 8 Сакавіка, мужчыны!»
**16.10, 5.00** «Турбаміксер».
**17.30, 0.30, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**18.00, 23.30** Серыял «Два бацькі і два сыны».
**19.00** Серыял «Мамачкі».
**20.00** Камедыя «Нявеста з заправкі».
**21.10** Камедыя «Кекс у вялікім горадзе».
**1.00, 3.30** «Дурні і дарогі».
**1.30** Серыял «Бязмоўны сведка».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.15** «Зорка чароўнага шчасця». Маст. фільм.
**14.00** «Эпізоды». Тацццяна Панкова.
**14.40, 16.05** Сусветныя скарбы.
**15.10** «Георгій Гамаў. Фізік ад Бога». Дак. фільм.
**16.20** Штучны адбор.
**17.05** «Больш, чым каханне». Рыгор Памяранцаў і Зінаіда Міркіна.
**17.45, 2.15** Рэно Гарсія-Фонс. Сола. Канцэрт у Марсэлі.
**18.30** «Эпізоды». Рэзо Габрыадзэ.
**19.15** «Дабранач, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Абсалютны слых».
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.10** «Гагарын». Дак. фільм.
**22.05** Улада факту. «Планавая эканоміка».
**22.45** «Астравы». Алена Якаўлева.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** «Дзядзька Ваня». Маст. фільм.
**1.30** А. Глазуноў. Канцэртны вальс.
**1.40** «Маё жыццё».

### Настальгія

**6.00** Дак. фільм «Выбары-96. Страсці па ўладзе». 1997 год.
**6.55, 8.50, 9.40, 11.00, 12.50, 14.45, 15.40, 17.00, 19.00, 20.40, 21.40, 23.00, 0.45, 2.15, 2.45, 3.30, 5.30** Музычная настальгія.
**7.20** Маст. фільм «Старая, старая казка».
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Андрэй Міронаў.
**13.20** Маст. фільм «Я вас кахаў...».
**18.00** «Бітламанамія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**19.20** Маст. фільм «4:0 на карысць Танечкі».
**0.00** «Акулы пяра». Гурт «Ногу свело».
**1.00** «Зямля—Паветра». Рыгор Лепс.
**2.30** Дак. фільм «Мода 91-92».
**3.00** Дак. фільм «Аляксандр Разенбаум. Твар у твар».
**4.00** Маст. фільм «Дзікі сабака дзінга».

### EuroSport 1

**3.30, 9.15, 16.30, 21.30** Біятлон. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
**4.00, 9.45, 19.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету.
**6.00, 10.30, 14.00, 0.00** Веласпорт. Парыж — Ніца.
**7.00, 11.30, 15.00** Снукер. Сусветнае Гран-пры.
**8.30, 13.00, 16.00** Біятлон. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**13.45** Watts.
**19.45, 2.10** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны.
**22.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны.
**1.05** Веласпорт. Цірэна — Адрыятыка.

### Камедыя

**0.45** Камедыя «Таксі 3».
**2.15** Камедыя «Прыгоды Падзінгтана».
**4.00** Камедыя «Таксі 2».
**5.30, 21.20** Камедыя «Парыж любой цаной».
**7.05** Камедыя «Пенелопа».
**8.50** Камедыя «Кактус».
**10.25** Меладрама «Круты паварот».



**12.20** Камедыя «Кахаю тваю жонку».
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Любовь-морковь».
**18.00** Камедыя «Піжон».
**19.40** Камедыя «Любовь-морковь-2».
**23.05** Меладрама «Назад да шчасця, або Хто знойдзе сінюю птушку».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.40** «Доктар І...»
**8.10, 19.00, 1.30** «Іфет». Серыял.
**10.00, 3.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.50, 3.45** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.50, 16.05** «Хатні рэстаран».
**12.45** «Нераскрытыя тайны».
**13.40, 17.55** «Пятая варта». Серыял.
**14.40** «Псіхасаматыка».
**15.15** «Мой герой».
**17.00, 4.35** «Знахар XXI стагоддзя». Дак.фільм.
**20.55, 0.05** «Блудныя дзеці». Серыял.
**22.35, 5.15** «Зоркі і містыка».
**23.20** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.00, 18.15** Драма «Філамена».
**8.10, 4.05** Меладрама «Каханне з перашкодамі».
**10.05, 1.50** Трагікамедыя «Моцная жанчына».
**12.20** Меладрама «Джэйн Эйр».
**14.25** Баявік «Шпіёнскія гульні».
**16.35** Камедыя «Як выкрасці дыямент».
**20.00** Драма «Пах жанчыны».
**23.10** Прыгоды «Лекар: Вучань Авіцэны».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 16.20** Меладрама «З 8 Сакавіка, мужчыны!»
**8.20, 2.20** Камедыя «Поўнае ператварэнне».
**10.20, 4.20** Меладрама «Восьмае сакавіка».
**12.20** Старое добрае кіно. Камедыя «Мільён у шлюбным кошыку».
**14.20** Камедыя «Горка! 2».
**18.20** Меладрама «Жаніх па аб'яве».
**20.20** Драма «Карасі».
**22.20** Іншае кіно. Драма «Браты Ч».
**0.20** Баявік «На гульні».

### National Geographic

**6.00, 9.10, 14.00, 19.25, 5.30** Гульні розуму.
**6.50** Займальная навука.
**7.40, 17.50, 21.00, 0.55, 3.55** Аўта-SOS.
**8.25, 18.40, 21.45, 1.40, 4.40** Сапраўдны суперкар.
**10.00, 14.45, 20.10** Чалавек супраць YouTube.
**10.50** Дзікі тунец.
**11.35** Шаша праз пекла.
**12.20** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**13.10, 0.00** Зрабі або памры.
**13.35, 0.30** Навуковыя недарэчнасці.
**15.30** Інстынкт выжывання.
**16.20** Па слядах міфічных пачвар.
**17.05** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**22.30, 3.10** Расследаванні авіякатастроф.
**23.20, 2.20** Эвакуацыя Зямлі.

### Discovery

**8.00, 12.30** Страсць да матораў.
**8.50** Забойныя дылемы.
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Бітва за нерухомасць.
**11.35, 7.10** Шалёная рыбалка.



**13.25, 6.25** І зноў не спрабуйце паўтарыць.
**15.15, 5.40** Класіка з Паўднёвага пляжа.
**16.10, 3.00** Вялікі махінатар.
**18.00** Праз любоў да машын.
**19.00** Таргі без тармазоў.
**20.00** У пагоні за класікай.
**22.00** Стальныя хлопцы.
**23.00** Паляўнічыя на старызну.
**0.00** Ліквідатар.
**1.00** Багажныя войны.
**2.00, 4.50** Паляўнічыя на рэліквіі.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

## Гараскоп на

**АВЕН.** У пачатку тыдня вы будзеце адчуваць прыліў сіл і ўпэўненасці, што дазволіць актыўна прасоўвацца наперад, дасягаць пастаўленых перад сабой мэт. Але варта паспяшацца, бо спрыяльны час працягнецца не вельмі доўга, а вашы сілы вельмі хутка могуць скончыцца. З сярэдзіны тыдня пачынаецца перыяд застою, які ў асноўным будзе выкліканы тым, што ў справах выявяцца новыя фактары і прымусяць вас займацца мітуслівымі момантамі, замест імклівага прасоўвання. Для адносін тыдзень не прадвяшчае якіх-небудзь поспехаў, могуць быць канфлікты.

**ЦЯЛЕЦ.** Варта выбраць нешта адно з усіх наяўных варыянтаў для рэалізацыі сябе. Не варта слухаць усё, што вам кажуць, бо гэта будзе толькі ўводзіць вас у зман. Неабходна сканцэнтравацца на бягучых справах і не спрабаваць лавіць жураўля. Калі знойдзеце паразуменне з сабой, то тыдзень будзе вельмі паспяховым і дазволіць палепшыць сваё матэрыяльнае (ці іншае) становішча. Тыдзень спрыяльны і для адносін, дзе ёсць магчымасць унесці яснасць і расставіць усё па сваіх месцах.

**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні будзе добра ладзіцца ўзаемадзеянне з іншымі людзьмі. Лёгка ўступаць у перамовы, усталёўваць патрэбныя сувязі. Сярэдзіна тыдня асабліва спрыяльная для рамантычных сустрэч. Але старайцеся ў гэты час не нагружаць сябе клопатамі, а прысвяціце час адпачынку ці няспешнаму прывядзенню спраў у парадак. У другой палове тыдня можаце пачаць самі сабе прыдумляць перашкоды і дадатковыя задачы, а потым іх жа пераадольваць. Не варта канцэнтравацца на дробных і нязначных падзеях.

**РАК.** Першая палова тыдня вельмі спрыяльная ў эмацыянальным плане, праўда, ёсць рызыка перанасыціцца падзеямі, таму прытрымлівайцеся пэўнай меры. Не варта імкнуцца паспець усюды і ўсё паспрабаваць. Каб апрытомнець і вярнуцца ў працоўны рытм, што ад вас запатрабуецца ў другой палове тыдня, давядзецца адшукаць свае ўнутраныя рэзервы, якія ў вас, безумоўна, ёсць. Калі паспраецеся, то адразу заўважыце, як у вас адкрыецца другое дыханне і з'явяцца новыя сілы.

